Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Н[illegible]А ПРАЎДА

„Przegląd Wileński" ul. Uniwersytecka 9-9

WILNO 1

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрац[illegible] Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńs[illegible] Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. [illegible] апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад [illegible]	[illegible] на адзін месяц з дастаўкай да хаты зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., [illegible]сьля тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 42 — Вільня, Субота 27-га жніўня 1927 г. — Год I

Бязьвінныя ахвяры.

Сакко і Ванцэтті, два італьянскія работнікі-рэвалюцыянэры, забіты амэрыканскім судом—бязьвінна.

Гэта сьцьвярджае ўвесь сьвет. Ня толькі працоўныя — аднадумцы забітых амэрыканскімі судзьдзямі мучанікаў за ідэю вызваленьня Працы спад панаваньня Капіталу. Сьцьвярджае гэта і эўрапэйская буржуазія. І калі чорнасоценска-фашыстаўская прэса ў Польшчы закідае работнікам усяго сьвету, быццам яны толькі выкарысталі дзеля падбураньня масаў проці буржуазіі факт асуджэньня двух „бандытаў", дык мы з усім перакананьнем павінны кінуць якраз у твар буржуазіі абвіненьне ў нягодным *правакаваньні ею працоўных* распраўай з бязьвіннымі людзьмі.

Так: у правакаваньні, бо-ж ня можа быць і гутаркі аб тым, каб амэрыканская буржуазія і яе „суды" хоць на мамэнт сумляваліся ў бязьвіннасьці Сакко і Ванцэтті. Амэрыканскай буржуазіі, відаць, выгадна выклікаць рэвалюцыйны выбух сярод сваіх работніцкіх масаў іменна ў гэты мамэнт—пакуль тыя яшчэ не гатовы да апошняга, рашаючага бою з Капіталам за сваё вызваленьне, — каб, здушыўшы работніцкі рух і ўтапіўшы яго ў моры крыві, на доўгія гады адцягнуць гэны страшны для буржуазіі і пабедны для працоўных бой. Гэта пацьвярджаюць і падаваныя намі факты нейкага бязмыснага кіданьня бомб на вагзалах і ў царквох—бясспрэчнае дзела рук паліцэйскіх правакатараў...

І правакацыя, здаецца, будзе „ўдатная": абурэньне работніцкіх масаў з прычыны забойства бязьвінных людзей—настолькі вялікае, што вострыя выступленьні проці буржуазіі, акты тэрору і т. п.— ужо не фальшаванага, а запраўды робленага рэвалюцыянэрамі, — няўхільны. Сьмерць Сакко і Ванцэтті—гэта сыгнал да *крывавае* барацьбы працоўных Амэрыкі з панаваньнем „радзімае" буржуазіі.

Паўтараем: барацьба гэтая ў Амэрыцы для работнікаў будзе сяньня цяжкая і — няўдатная. Лішне вялікую сілу йшчэ мае ў сваіх руках амэрыканская буржуазія, лішне крэпка трымае дзяржаўную ўладу ў сваей „дэмакратычнай" рэспубліцы, каб работнікі маглі спадзявацца на перамогу ўжо ў гэты мамэнт. Але барацьба ў Амэрыцы гулкім рэхам адгукнецца па ўсенькім сьвеце — ўсюды, дзе былі выступленьні масаў з пратэстам проці казьні Сакко і Ванцэтті. І амэрыканская буржуазія, сама таго не спадзяючыся, — хоць у сябе дома і пераможа рэвалюцыйны выбух пратэсту,—дапаможа прабуджэньню *клясавае салідарнасьці сярод работнікаў усіх краёў і народаў*, дапаможа прабуджэньню ў іх *клясавае сьвядомасьці* і — прысьпешыць мамэнт апошняга сусьветнага бою Працы з Капіталам, — бою, у якім перамога *мусіць* быць на старане працоўных!

Мусіць, бо-ж у працоўных ёсьць — апрача сілы фізычнай—яшчэ і другая сіла, якой яны ўжо б'юць буржуазію: гэта—*сіла маральная*. Забойцы Фэррэра ў Гішпаніі, забойцы Жорэса ў Францыі, забойцы Лібкнэхта і Розы Люксэмбург у Нямеччыне, урэшце — забойцы Сакко і Ванцэтті ў „свабоднай" і „дэмакратычнай" Амэрыцы—ўсе яны даўно ўжо згубілі сваю маральную сілу і маральнаму націску працоўных даць адпору ня здолеюць. І ў рашучы мамэнт гэтай сваей маральнай сілай перамогуць—працоўныя.

А сіла гэтая ў працоўных расьце і будзе расьці ўсьцяж. Хай пагібаюць ад рукі ката лепшыя барацьбіты за вызваленьне працоўных, хай Сакко і Ванцэтті зыйшлі бязьвінна ў магілы, як мучанікі за сьвятасьць сваей ідэі: іх сьветлыя цені лунаць будуць над арміяй працоўных у дзень вялікае і рашаючае бітвы за шчасьце „вякамі катаваных", іх імёны— два новыя сьцягі, якія павядуць працоўных да канчатковае перамогі.

Нішто ў сьвеце не праходзе бяз сьледу. Тым балей — бязьвінныя ахвяры за вялікую ідэю.

Казьнь Сакко і Ванцэтті.

Да казьні.

Адчайная барацьба абароны. Судовая валакіта.

Гэраічныя высілкі абароны разьбіваліся адзін за адным.

Акружны судзьдзя Мортон адмовіўся выдаць „habeas corpus"—акт (дэкрэт аб забясьпечаньні асобы) для Сакко і Ванцэтті. Далей судзьдзя найвышэйшага трыбуналу Злучаных Штатаў адмовіўся даць загад аб адкладзе казьні. Дзякуючы таму, што ён у сваей адмове пакінуў магчымасьць зьвярнуцца ў гэтай справе да іншага судзьдзі, абарона пастанавіла зьвярнуцца да судзьдзі Брандайса. Але і гэты адмовіўся, кажучы, што ня мае права. Тады абарона зьвярнулася да судзьдзі Стона, былага міністра справядлівасьці. Стон, аднак, таксама адмовіўся даць загад аб адкладзе казьні.

Абарона паслала спэцыяльны аэраплян, каб прывезьці з Канады ў Амэрыку старшыню найвышэйшага трыбунала Тафта. Тафт, які адпачывае ад „трудоў праведных" у Канадзе, заявіў, што ён ня мае права ўрадаваць па-за межамі Амэрыкі, аднак, даў згоду пераехаць граніцу, калі гэта будзе патрэбна.

Між тым у адказ на захады абароны даць ёй акты аб Сакко і Ванцэтті міністэрства справядлівасьці адказала, што яно гэтыя акты можа даць Фулеру, калі той зажадае, але не абароне.

Як трымаліся засуджаныя.

Засуджаныя зусім панавалі над сабой. Ванцэтті бачыўся з сястрой.

Сястра Ванцэтті заявіла кардыналу Оконэль, што яна ня будзе больш дакучаць брату, які і надалей станоўча адмаўляецца ад ксяндзоўскай „духовай пацехі".

Пратэсты ў Амэрыцы.

Уся амэрыканская прэса перапоўнена хатнімі і заграмічнымі пратэстамі.

Шматлікія газэты зьмясьцілі верш Эдмы Сэнтуапцэнт, найслаўнейшай амэрыканскай паэткі, пасьвячоны „правасудзьдзю".

„Нью-Іорская Трыбуна", адна з найвялікшых газэт, радзіла пану Фулеру заглянуць у тайныя акты міністэрства юстыцыі, якія даступны яму, і глянуць у якія было адмоўлена абароне. Відаць, цікавыя там факты, калі скрываюць іх гэтак ад абароны,—дадамо ад сябе! Ну, а пану Фулеру дарма ўжо буржуазная газэта радзіла туды глянуць, бо ён і так добра паінфармаваны. Няма чаго вочы заціраць.

Паміж мнагалікімі пратэстамі, зьмешчанымі ў прэсе, асабліва годным увагі зьяўляецца пратэст, падпісаны 600.000 (шэсьцьсот тысячамі) асоб з усіх штатаў Паўночнай Амэрыкі. Прафэсары, пэдагогі, публіцысты, палітыкі, прафэсіянальныя дзеячы — усе падпісваліся над пратэстам. Паміж імі гэткія знаныя асобы, як: праф. Камоно, Джон Дэвэй, агулам нодпісы прафэсароў з 14 унівэрсытэтаў.

Цікава адзначыць пратэст Джонсона, які быў міністрам юстыцыі штату Нью-Іорк у працягу 20 год. У сваім пратэсьце Джонсон піша, што ён з справаздачы фулераўскага камітэту (аб ім было ў свой час пісана) прыходзе да зусім процілежных вывадаў і лічыць Тэйэра за этычна-дэклясыфікаванага, нягоднага далей займацца гэтай справай, і дзеля гэтага дамагаецца новага разгляду справы. Джонсон у сваей тэлеграме да Фулера называе ўсю справу „забойствам амэрыканскай юстыцыі".

Між зьмешчанымі ў прэсе пратэстамі знаходзіцца тэлеграма біржавой канторы, якая выразна падкрэсьлівае, што яна прадае дзяржаўныя займы і таму зьяўляецца апорай дзяржавы. Якраз дзеля гэтага яна й лічыць сваім абавязкам перасьцерагчы перад тварэньнем „чырвоных мучанікаў".

Ці трэба лепшага прыкладу, чым фактычна вызван пратэст буржуазіі? Тое, што паны міністры, і вучоныя паслугачы буржуазіі розных фахаў і рангаў думаюць, крычучы патэтычна аб забойстве „справядлівасьцяй" і ўсякія іншыя прыгожыя фразы і словы, — тое зусім адкрыта і выразна сказаў пратэст гэтай фірмы.

Крокі для захаваньня цішыні і парадку.

Улада тасавала ўсе меры дзеля захаваньня „парадку", хоць да гэтага часу ня было значных нарушэньняў яго. Першы раз за ўвесь час існаваньня Злучаных Штатаў Паўночнай Амэрыкі паліцыя з стрэльбамі ахраняла Вашынгтонскі Капітоль. Адна кабеціна, пуцяводніца чужынцаў у Капітолі, выгнана са службы за тое, што выявіла свае сымпатыі для Сакко і Ванцэтті. Нэрвовасьць кіруючых чыньнікаў дасягнула гэтакай ступені, што міністар вайсковых спраў выдаў загад, у якім перасьцерагаў, каб ня прыймалі незарэгістраваных чужынцаў у дамовую службу. Пан вайсковы міністар баіцца, як відаць, навет і кухарак!..

Як папярэднім разам, таксама і цяпер турма, у якой сядзелі засуджаныя, была акружана салдатамі. Прылягаючыя кварталы былі адрэзаны кардонамі паліцыі, праз якія прапускалі толькі жыхароў гэтых кварталаў на асобным пропускам. Скрозь былі расстаўлены кулямёты.

Верныя слугі.

Прадстаўнікі 30 „жоўтых" (згодніцкіх з буржуазіяй) прафэсіянальных саюзаў, якія злучаюць 400 тысяч душ, сабраліся ў памешканьні Нью-Іорскага камітэту ратаваньня Сакко і Ванцэтті і пастанавілі... ня прыняць учасьця ў забастоўцы пратэсту, аб'яўленай у дзень казьні, кажучы, што гэта — акцыя камуністаў!

Не адсталі ад іх і міжнародавыя „пэпэсы". Прэзыдыум Праф. Інтэрнацыяналу адкінуў большасьцю галасоў прапазіцыю сусьветнай пратэстнай забастоўкі. Варт Пац палаца, а палац Паца. Не дарма Амстэрдамскі Праф. Інтэрнацыянал гэтак рвецца да супрацоўніцтва з „жоўтымі" саюзамі Амэрыкі.

Дэманстрацыі.

У Бастоне перад казьняй у панядзелак адбылася дэманстрацыя. Ня глядзячы на забарону паліцыі, у дэманстрацыі прыняло ўчасьце 20 тысяч асоб. Конная паліцыя з нячуванай грубасьцяй атакавала дэманстантаў. Маса людзей арыштавана, між імі вядомы пісьменьнік Джон-Дас-Пасак.

Кангрэс нацыянальных меншасьцяў у Жэнэве.

22-га жніўня распачаўся у Жэнэве ўрачыста III кангрэс дэлегатаў нацыянальных меншасьцяў. Зьехалася каля 100 дэлегатаў, якія прадстаўляюць 41 групу нацыянальных меншасьцяў розных дзяржаваў Эўропы.

Старшынёй кангрэсу выбраны прадстаўнік славенскай меншасьці ў Італіі пасол Вільфан.

Як ведама, на папярэднім кангрэсе была прынята тактыка поўнай „лаяльнасьці" меншасьцяў адносна да „сваіх" дзяржаваў— быццам навет побач з поўным зрачэньнем думкі аб барацьбе за незалежнасьць. Дзеля таго цэлы рад тэрытарыяльных меншасьцяў розных краёў, якія не згадзіліся на гэткае прынцыповае становішча кангрэсу, заявілі праз сваіх дэлегатаў, што ня лічаць сябе сябрамі кангрэсу, а зьяўляюцца на ім толькі наглядчыкамі. Гэткія заявы зрабілі, паміж іншымі, беларусы і літвіны з Польшчы, баўгары з Югаславіі і інш.

Цяпер, як паведамляе „Усход. Агенцтва" (польскае), цэлы рад дэлегатаў ад меншасьцяў заявіў аб сваім далучэньні да „аб'яднаньня нацыянальных меншасьцяў", выражэньнем якога зьяўляецца кангрэс. Паміж імі—беларусы і літвіны з Польшчы... Але старшыня дадаў, што дзеля таго, каб прыняць гэтыя меншасьці ў склад „Саюзу", трэба сьпярша зьмяніць яго Статут...

Што гэта ўсё дакладна азначае, пакульшто вестак ня маем. Трудна дапусьціць, што Статут будзе зьменены — у бок права „нелаяльнасьці" меншасьцяў у адносінах да „сваіх" дзяржаваў. Хутчэй трэба дапусьціць можа зьмену „прынцыповага становішча" тых беларусаў і літвіноў, якія выслалі на кангрэс сваіх дэлегатаў. Пачакаем, што будзе далей.

Цяпер толькі дадамо, што—паводле мясцовай прэсы — на кангрэс гэты „ад беларусаў" выехаў пасол Рагуля, якому даў мандат сфабрыкаваны машэнскім спосабам „другі" Бел. Нац. Камітэт—спэцыяльна ксяндзоўска ярэміцка-рагуляўскі...

Меншасьць—ці большасьць?

(Да зьезду нацыянальных меншасьцяў).

У Жэнэве адбываецца зьезд нацыянальных меншасьцяў з цэлага раду дзяржаў Эўропы.

Гэта ўжо ня першы зьезд гэтага роду. Прадстаўнікі нацыянальных меншасьцяў у асобах дэлегатаў буржуазных партыяў гэных меншасьцяў ужо трэці раз зьбіраюцца пад бокам Лігі Народаў, ускладаючы свае надзеі і спадзяваньні на тое, што Ліга Народаў зробіць адпаведні націск на тыя ўрады, якія ўціскаюць „свае" меншасьці. Аднак, спадзяваньні і надзеі гэтыя—дарэмныя: „акцыйнае таварыства" гэных самых урадаў, якія душаць „свае" меншасьці, ні ў якім выпадку ня выступіць проці сваіх-жа сяброў, бо кожын сябра Лігі дужа добра ведае, што толькі пры сыстэме „заплюшчаных вачэй" на грахі і праступкі іншых ён забясьпечывае бяскарнасьць самаму сабе.

У справе так-званых нацыянальных меншасьцяў мы мусім адзначыць адзін мамэнт, які навет і для веручых у „вышэйшую справядлівасьць" Лігі Народаў робіць надобныя зьезды бязмэтнымі. Гэта — няправільная прынцыповая пастаноўка самае справы нацыянальных меншасьцяў. Бо-ж ініцыятары зьездаў аднолькава разглядаюць справу нацыянальнасьцяў, якія жывуць на чужой зямлі, ды сярод чужое для іх нацыянальнае большасьці, і справу тых нацыянальнасьцяў, якія і на сваей уласнай тэрыторыі жывуць, і на гэтай тэрыторыі прадстаўляюць большасьць, а ня меншасьць, толькі гэная іх зямля разам з імі аддадзена пад уладу другога народу — больш чысьленага. Дык калі, прыкладам, для жыдоў у Польшчы існуе толькі пытаньне аб забясьпечаньні іх культурна-нацыянальных правоў — шляхам культурна-нацыянальнае аўтаноміі,—то для беларусаў пытаньне йдзе ня толькі аб прызнаньні іхніх правоў, як меншасьці, раўнуючы да ўсяе Польскае рэспублікі, але і аб забясьпечаньні ім права быць гаспадарамі на тым куску сваей уласнай зямлі, дзе беларускае насяленьне прадстаўляе большасьць.

Зьезды нацыянальных меншасьцяў, якія дагэтуль адбываліся, гэтага другога пытаньня разглядаць зусім не хацелі. З гэтае прычыны беларусы і ўкраінцы прымалі ўчасьце ў гэных зьездах выключна, як госьці — наглядчыкі („обсэрватары"). І зусім правільна: беларусы і ўкраінцы—народы тэрыторыяльныя, знача—маюць сваю ўласную зямлю, хоць яна аддадзена чужым дзяржавам, і ніколі ня згодзяцца на тое, каб іх на гэтай іх роднай зямліцы нехта разглядаў, як „меншасьць", як нейкіх гасьцей — прыблуд! Беларусы і ўкраінцы ня могуць згадзіцца на тое, каб у іх родным краю панавала чужацкая меншасьць— толькі на тэй падставе, што гэтая нацыянальнасьць заўладала іхняй зямлёй. Дык з усіх гэных зьездаў „меншасьцяў" для нас карысьці спадзявацца нельга—апрача іншых прычын — яшчэ й затым, што нашая справа тамака пастаўлена няправільна.

Сёлета на зьезд меншасьцяў у Жэнэву паехаў пасол Рагуля, маючы „мандат" ад самазванага, ашуканскага „Нацыянальнага Камітэту". Ня ведаем, якія дырэктывы дала яму гэная ашуканская установа, і маем падставу баяцца, каб ягонае становішча не аказалася на зьезьдзе настолькі-ж фальшывым, наколькі фальшывым зьяўляецца ягоны „нацыянальны пашпарт". Як-бы там ні было, мы мусім сьцьвярдзіць, што, ніводзін запраўдны беларус ніколі ня згодзіцца, каб у Заходняй Беларусі да яго адносіліся ягоныя „валадары", як да „меншасьці": на сваей зямлі—мы большасьць, дый ніколі не зрачэмся вынікаючых з гэтага нашых правоў— быць гаспадарамі на сваей тэрыторыі.

К. Ф.

Казьнь Сакко і Ванцэтті.

У той час, калі на ўсенькім сьвеце раздаваліся бурныя і вялізарныя пратэсты, Бастон маўчаў. Уся паліцыя, войска і пажарнікі былі змабілізаваны, каб у зародку здушыць усякую дэманстрацыю. Навакол турмы стаялі сотні азброеных жаўнераў і паліцэйскіх, каб у разе патрэбы не дапусьціць да адбіцьця й вызваленьня сілай гэтых ахвяр буржуазіі. Кулямёты, панцырныя аўтамабілі, газавыя бомбы — былі ў баявой гатоўнасьці. Бранявікі і матацыклеткі лёталі па вуліцах. Пражэктары, як у дзень, асьвятлялі ўсю ваколіцу турмы. Прыхільнікі Сакко і Ванцэтті былі разагнаны, вуліцы закрыты для руху.

У гэты час у турме разьвітваліся з роднымі і прыяцелямі Сакко і Ванцэтті. Каты рабілі сваю работу: галілі галовы засуджаным. Спакойна, пануючы над сабой, праводзілі свае астатнія гадзіны засуджаныя, адмовіўшыся прыняць „духоўную пацеху“.

Першым быў сказьнёны крыміналіст Мадэйрас. Не пасьпелі яшчэ забраць ягоны труп, як увялі Сакко. Ен—бляды, але сьвядомы сваей годнасьці і пануе над сабой. Уваходзячы ў пакой сьмерці, ясным голасам закрычэў Сакко: „Хай жыве Анархізм! Бывайце здаровы, жонка, дзеці і мае прыяцелі“! Яго прывязываюць, узьдзяваюць маску і ціха прагучэла: „Бывай, маці“! Дрыжыкі прабягаюць па целе, адзін скорч — і ўсё скончана...

Труп адвязываюць ад крэсла, і ўваходзіць Ванцэтті. І ён спакойны. Увайшоўшы, ён акідае вокам сьведкаў і кажа: „Я нявінен; хоць я рабіў праступкі, але ніводнага праступленьня не зрабіў. Я—бязьвінны чалавек“. Пасьля ён сеў на крэсла. Злучэньні з машынай накладаюцца на рукі і ногі. Яшчэ раз ціха чуецца: „Я хацеў-бы даравацъ некаторым людзям тое, што яны зараз мне робяць“. Ледзьве чуцен трэск ўключацеля, — і няма чароднага!..

Ліст Сакко.

Прэса апублікавала адрывак з патрасаючага, як яна называе, ліста Сакко да свайго 13 гадовага сына. Сакко заклікае яго, каб быў сільным, памагаў матцы, бараніў слабейшых. Вось, малы адрывак, зьмешчаны ў прэсе:

„Мы многа цярпелі на нашай доўгай крыжавой дарозе. Ідзе барацьба між беднасьцю і багацтвам, уціскам і свабодай, якую ты пазьней зразумееш. Я пішу з дому сьмерці, які трэба было-бы зьнішчыць молатамі поступу і на яго мейсца пабудаваць майстроўню, або школу для сірот“.

Спаленьне цел загубленых.

Камітэт Абароны паведамляе, што немагчыма выставіць целы забітых у ўсіх местах Амэрыкі.

Целы забітых будуць спалены ў нядзелю ў Бастоне, пасьля чаго сястра Ванцэтті возьме попел брата і павязе яго ў Нью-Іорк, Лёндан, Парыж, Бэрлін, Штокгольм і інш. гарады — перш, чым пахаваць яго ў Італіі.

Пасьля казьні.

Амэрыка. Па ўсей Амэрыцы адбыліся вялізарныя дэманстрацыі. Шмат арыштаваных. У Камэроне дайшло да бітвы з паліцыяй. Адзін паліцэйскі забіты. У Сан-Францыско заарыштаваны 127 дэманстрантаў.

Аргентына. У тутэйшых фабрыках Форда ўзарвалася бомба, нарабіўшы надзвычайна вялікіх шкод. Муры будынку разваліліся. Многія суседнія дамы часткова разбураны. Гэтае пакушэньне стаўляюць у сувязь з пратэстам проці казьні Сакко і Ванцэтті. Чалавечых ахвяр няма.

Трэцяя генаральная забастоўка пратэсту прайшла ў Аргентыне поўнасьцю. Па ўсіх мяйсцовасьцях адбыліся вялізарныя дэманстрацыі. Як толькі прыйшла вестка аб казьні, вялікія натоўпы народу пачалі разьбіваць амэрыканскія фірмы. Паліцыя ня мела магчымасьці перашкодзіць гэтаму.

Швайцарыя. У Жэнэве з прычыны казьні дайшло да сільных забурэньняў. У выніку бойкі дэманстрантаў з паліцыяй забіты адзін дэманстрант і ранена 25.

Маніфэстацыя прайшла па галоўным вуліцам, кідалася на амэрыканскі кансулят і кінэматографы, гдзе паказывалі амэрыканскія фільмы. Дайшоўшы да Палацу Лігі Народаў, натоўп параз̆ьбіваў каменьнямі вокны салі паседжаньняў. Таксама былі павыбіваны вокны ў адным гатэлі, у якім пераважна жывуць амэрыканскія мільянэры.

Францыя. Ня менш абураны і працоўныя масы Францыі. У Парыжы, ня гледзячы на забарону паліцыі, камун. партыя і камітэт абароны Сакко і Ванцэтті склікалі дэманстрацыю і мітынгі. Адбываюцца бойкі з паліцыяй. Камітэт абароны апублікаваў наступную адозву:

„Народ Парыжа! Сталася. Сакко і Ванцэтті загінулі, бо лятуцелі аб лепшай будучыні чалавецтва. Народ Парыжа, ты мусіш разам з намі выявіць сваё абурэньне. Народ Парыжа, памятай аб сваім абавязку падтрымаць абодвух мучанікаў навет пасьля іх сьмерці. Да пабачаньня ўвечары“!

Маніфэстацыя, склíканая Камітэтам Абароны і Кам. Партыяй у Парыжы, пайшла па Сэвастопальскім бульвары. Сустрэўшыся з паліцыяй, дэманстранты пачалі будаваць барыкаду, карыстаючыся зялезнымі кратамі з магазынаў, мяшкамі цэманту, матэрыяламі з блізкіх складаў, валячы з карэньнямі дрэвы на бульвары. Паліцыя, аднак, не дапусьціла да збудаваньня яе. Спроба ізноў паўтарылася. З другога боку другая група дэманстрантаў імкнулася прарваць кардон паліцыі на Элізэйскіх палях, каб дастацца пад гмах Амэрыканскага пасольства. Паліцыя адбіла атаку дэманстрантаў. Пры адступленьні дэманстрантаў узьнялася бойка між панамі, што сядзелі ў кавярнях, і работнікамі. Пачалася між імі перастрэлка. У поўначы запанаваў спакой. Паліцыя арыштавала 200 асоб. У часе ўсіх гэтых боек ранена 40 асоб.

У Монпэлье адбыліся вялізарныя дэманстрацыі, якія прашлі спакойна. У поўначы жыхары места былі разбуджаны страшэнным узрывам, які здарыўся перад паліцэйскай камэндантурай. Адзін паліцэйскі ранены ў галаву. А 4 гадзіне раніцы здарыўся другі страшны выбух перад турмой. Ахвяр няма.

Дэманстрацыі адбываюцца па ўсіх гарадох Францыі, пры чым выносяцца пастановы байкоту амэрыканскіх тавараў і фільмаў.

Нямеччына. У Лейпцыгу адбылася вялізарная дэманстрацыя. Дайшло да боек з паліцыяй. У выніку гэтага адзін з дэманстрантаў забіты, а другі цяжка ранены. Лік лёгка раненых дэманстрантаў з зразумелых прычын ня ўсталены. Пабіта крэпка і паліцыя.

У іншых гарадох дэманстрацыі праходзяць спакайней. Арыштовываюць, аднак, дэманстрантаў масамі. У Бэрліне дык, назьдзеў, навет бяз гэтага абышлося.

Галяндыя. У Амстэрдаме на вялікім пляцу перад каралеўскім замкам адбываліся маніфэстацыі. Дайшло да бойкі з паліцыяй, у выніку гэтага шмат раненых. Вайсковы гарнізон места ўзмоцнены.

У Ротэрдаме і Газе ў часе дэманстрацыяў паліцыя ізноў умяшалася. Як заўсёды бывае, так і тут, умяшаньне „абаронцаў асабістай бясьпечнасьці“ прынясла з сабой небясьпеку для жыцьця многіх дэманстрантаў. Вынік — шмат раненых у абодвух выпадках.

Польска - Радавыя перагаворы.

Польскі пасол Патэк у Маскве.

Польскі пасол Патэк 20 жніўня ізноў выехаў у Маскву, дзе мае на падставе атрыманых у Варшаве новых інструкцыяў—распачаць перагаворы з Чычэрынам у справе заключэньня **гаранцыйнага трактату і гандлёвай умовы Польшчы з ССРР.**

Апошнія весткі а польскіх крыніцаў кажуць, быццам Чычэрын прыняў прапазіцыі польскага пасла ў вышэй сказаных справах.

Заява пасла Патка.

У „гутарцы“ з данскім журналістам п. Патэк заявіў, што справа перагавораў з Радамі наагул стаіць добра. — Перагаворы маюць распачацца ў найхутчэйшым часе. Агульная атмасфэра ўзаемных адносінаў абодвух урадаў—добрая і спрыяючая пасьпеху перагавораў. Але польскі пасол дадаў вельмі цікавую ўвагу: што трактат між Польшчай і ССРР аб узаемным ненападаньні і нэйтралітэце атрымаў-бы для Польшчы дый для эўрапэйскага міру рэальнае значэньне, калі б такія-ж трактаты былі заключаны і ўсемі іншымі заходнімі суседзямі ССРР. Мір у ўсходняй Эўропе быў бы гарантаваны толькі тады, калі была-б загарантавана Эўропай... уся заходняя граніца ССРР...

Данскі журналіст дадае, што з таго, што сказаў п. Патэк, выходзіць, што ўсе трактаты Польшчы з ССРР будуць мець дзеля гэтага толькі **тымчасовы характэр**, а ўвойдуць у запраўдную рэальную сілу толькі пасьля таго, як будуць пашыраны на ўсе балтыцкія дзяржавы...

Адным словам, як кажуць расейцы: „дрэнны мір — замест добрай сваркі“, або: дрэнны мір. які можа ў кожную хвіліну заступіць „добрая сварка“...

Пасьпех перагавораў—запэўнены...

Трывога ў Нямецкай прэсе.

Нямецкая прэса вельмі цікавіцца і трывожыцца маючымі распачацца перагаворамі між польскім і радавым урадамі ў справе ўзаемнага забясьпечаньня міру і граніцаў між Польшчай і ССРР.

Трэба адзначыць, што ня меншую трывогу выяўляе і радавая прэса з прычыны нейкай „тайнай ігры“ нямецкага ўраду з англійскім... Англійцы хочуць за ўсялякую цану ўцягнуць Нямеччыну ў „кола англійскай палітыкі“, гэта значыць прасьцей: у проціраадавую авантуру...

Англійская ігра і нямецка-радавыя адносіны.

Як спрытна вядуць гэтую ігру англійцы, ня трэба казаць.—Напрыклад, цяпер Нямеччына рашуча выставіла трэбаваньне в. значнага зьмяншэньня акупацыйных войск, калі ня поўнай ліквідацыі акупацыі. Англійцы робяць від, што рашуча націскаюць на няўступлівую Францыю—на карысьць Нямеччыны. Англійская прэса піша, быццам Пуанкарэ гатовы згадзіцца навет на скасаваньне акупацыі, але за цану гарантаваньня Нямеччынай яе ўсходняй (польскай) граніцы... Ведаючы, што Нямеччына ніколі на гэта ня згодзіцца, англійская прэса дадае, што і англійскі ўрад, які добра ведае, што бяз Англіі няма ніякіх гарантыяў у Эўропе, ніколі ня згодзіцца, каб справы гэтыя—скасаваньня акупацыі і зацьвярджаньне польска-нямецкай граніцы—злучаліся ў адно, як гэтага трэбуе Францыя... А кожны добра разумее, як адразу страцілі-бы ўсю сваю сілу нямецкія пагрозы заходнім граніцам Польшчы, калі-б Польшча здолела карыснай для сябе ўмовай з ССРР замацаваць і гарантаваць свае ўсходнія граніцы, ды гэтым самым забясьпечыць свае тылы на выпадак аружнага канфлікту з немцамі...

Вось дзеля чаго немцы з такой трывогай сочаць за „маючымі распачацца“ перагаворамі аб гаранцыйным трактаце між Радамі і Польшчай...

Тымчасовая тымчасовасьць.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што і Польшча, „шчыра жадаючы“... распачацьця перагавораў з Радамі, зусім не выяўляе рашучага жаданьня рваць свае „сувязі з англійскай палітыкай“, як аб гэтым пішуць варшаўскія карэспандэнты нямецкіх газэт. Усё гэта ясна выразілася ў тым, што пасол Патэк мае падпісваць з Радамі, як сам сцьвярдзіў,—**толькі тымчасовыя трактаты...**

Сабраўшы ўсё вышэй сказанае ўвадно, мы зразумеем, у якіх заблутаных міжнародава-палітычных варунках маюць распачацца тыя перагаворы ў Маскве, якія маюць—таксама тымчасова—загарантаваць граніцы і мір у ўсходняй Эўропе...

Як бачым, усё пытаньне толькі ў тым, як можа быць азначаны ці прадбачаны рэальны зьмест гэтай „тымчасовасьці“...

Як было дагэтуль?

Трэба прыпомніць, што „польска радавыя перагаворы“ цягнуцца ўжо некалькі гадоў узапар.—У 1925 г.—перад канфэрэнцыяй у Лёкарно, калі Нямеччына, здавалася, гатова была — пад націскам Англіі і Францыі—„здрадзіць ССРР“, а Англія з Францыяй—здрадзіць Польшчу на карысьць Нямеччыны,—між абыдвума краямі, якія апынуліся перад небясьпекай здрады з боку сваіх саюзьнікаў, запанавала раптам „сэрдэчная згода“, якая, нажаль, аказалася хутка—таксама „тымчасовай“... Мы памятаем, як тады—праездам у Эўропу—прыехаў у Варшаву Чычэрын, якога прынялі ў сталіцы Польшчы, амаль не як роднага... Як доўга пасьля таго між п. Скшыньскім і Чычэрыным ішлі „перагаворы“, якія не перашкодзілі зусім таму, каб цяпер—„мелі распачацца“ ізноў — зусім новыя?! — Дык і цяпер трэба памятаць, што міжнародавыя абставіны яшчэ залішне заблутаныя ў Эўропе, каб так лёгка дайшлі да скутку перагаворы аб тым, каб — зрабіць „цьвёрдымі“ тыя граніцы ў ўсходняй Эўропе, якія,—у сілу агульных „фізычных варункаў“—і „палітычнай тэмпэратуры“ на гэтым „Усходзе Эўропы“,—могуць быць толькі ў „плыўкім стане“...

Бо ж, калі навет значна больш „заходняя“ — польска-нямецкая граніца дагэтуль прызнаецца навет у Англіі „плыўкай“, дык што ж казаць ужо аб граніцах значна больш „усходніх“?!...

„Пасланьне Мітрапаліта Сергія“.

Праваслаўная Царква ў ССРР выражае ляяльнасьць у адносінах да Радавага Ураду.

У „Известиях“ надрукавана сэнсацыйная заява мітрапаліта Сергія, які мае часовыя правы Галавы ўсей Праваслаўнай Царквы ў ССРР, замяшчаючы яе Патрыярха.

Заява гэтая зьявілася ў выніку паразуменьня з радавай уладай, якое адбылося яшчэ ў траўні с. г. „Пасланьне“ мітрапаліта, падпісанае—апрача яго — яшчэ 5 архіяпіскапамі і 1 япіскапам ад імя новага Сыноду, заяўляе, што Праваслаўная Царква ў ССРР **прызнала законным Радавы Урад і заклікае да таго ж прызнаньня ўсе праваслаўныя абшчыны ў ССРР і заграніцай, як і ўсё праваслаўнае духавенства.**

„Пасланьне“.

„Усе мы чуем усё больш выразна,—кажа „Пасланьне“, — што цяпер ужо ў ССРР ёсьць магчымасьць спакойнай працы і забясьпечанага жыцьця—пад уладай Радаў і законаў Саюзу. Цяпер, калі ў ССРР гэтая, так жаданая намі ўсімі, мэта амаль-што ўжо дасягнута. падпольная смуцьянская праца ворагаў радавай улады заграніцай разгараецца з новай сілай, выяўляючыся ў забойствах, як гэта было ў Варшаве, у нападах на нашых заграничных пасloў, у кіданьні бомбаў, у грабяжох ды падпалах. Гэтая дзеяльнасьць ворагаў Радавай Расеі згубна адбіваецца на ходзе нашага мірнага жыцьця і працы, а дзеля таго неабходна безадкладна, каб царкоўна-мысьлячае насяленьне й духавенства не падтрымлівалі ворагаў радавага ўраду, але наадварот — ішлі б поруч з усім нашым народам дый нашым сучасным урадам.

„Праўда, шмат хто з нашых братоў лічыць радавы ўрад уладай выпадковай і дачэснай. Але яны забываюць, што рука Божая заўсёды вядзе чалавецтва згары азначаным, ведамым Богу, шляхам. Пасьля таго, як сам Патрыярх Ціхан пастанавіў трымацца поўнай ляяльнасьці адносна да радавай улады, усе павінны пакінуць у хаце свае палітычныя пагляды і працаваць выключна ў інтарэсах нашай супольнай веры, або—**выйсьці з лона царквы, каб гэтай абструкцыі (спраціву) з боку гэтых палітыкаў быў паложаны ўрэшце канец“...**

Значэньне „Пасланьня“:

Вялізарную важнасьць гэтай заявы падчырківае тое, што мітрапаліт Сергій, заступнік Патрыярха, быў дагэтуль **галоўным барацьбітам проці радавай улады**, як і ўсе тыя япіскапы, якія падпісалі заяву побач з ім.

Гэткім чынам, у ССРР няма ўжо больш афіцыяльнай Праваслаўнай Царквы, якая-б не прызнавала радавае ўлады. Мала таго: тая самая Ціханаўская, Патрыяршая Праваслаўная Царква, якая грунтуецца на Усерасейскім Саборы 1917 г., ды якая дагэтуль была ў выразнай апазіцыі, цяпер—у складзе яе „галоўнага штабу“, у складзе якраз 7 асобаў, падпісаўшых „Пасланьне“, — **становіцца на чале афіцыяльнай праваслаўнай царквы ССРР і заграніцай, як новы Сьвяты Сынод, які будзе** адгэтуль упраўляць Царквой у ССРР і заграніцай у паразуменьні з Радавай Уладай.

Гутарка з мітрапалітам Сергіем.

„Известия“ побач з „Пасланіем“ друкуюць гутарку мітрап. Сергія з супрацоўнікам газэты. У гутарцы галава Праваслаўнай Царквы ў ССРР пацьвярдзіў — ад імя Сыноду, што „ён прызнае Радавую Уладу нармальнай і шчыра гатовы падпарадкавацца яе распараджэньням. На выпадак вайны Радаў з вонкавым ворагам, Праваслаўная Царква будзе падтрымліваць Радавы Урад, бо расейскае духавенства хоча служыць сваей айчыне“. Мітрапаліт у канцы дадаў, што ён ужо зьвярнуўся да прадстаўнікоў зарубежнай Царквы з прапазіцыяй заняць ясную пазіцыю адносна да пастановы Сыноду. Ад гэтага будзе залежаць, ці гэтыя зарубежныя Царквы астануцца ў „супольнасьці“ з Расейскай Праваслаўнай Царквой.

Новы закон аб Праваслаўнай Царкве і склíканьне Сабору.

У сувязі з гэтай прынцыповай зьменай у адносінах між Царквой і Радавай Уладай, Радавы Урад заявіў, што ў хуткім часе будзе апрацаваны новы закон, рэгулюючы палажэньне Праваслаўнай Царквы ў ССРР. Старшыні Сыноду маюць быць дадзены надзвычайныя паўнамоцтвы дзеля склíканьня **новага Усерадавага Сабору Правасл. Царквы.**

Водгукі заграніцай.

Эміграцкая прэса страшэнна ўсхвалявана „Пасланьнем“ мітрапаліта Сергія, а перадусім — яго заявай аб тым, што ўсе зарубежныя праваслаўныя арганізацыі, якія ня прызнаюць Радавае Улады, тым самым будуць адлучаны ад Праваслаўнай Царквы...

Практычныя вынікі.

Ведама, што міжнародавая буржуазія (з англійскімі фашыстамі на чале!), арганізуючы „сусьветны проціраадавы фронт“, апэлявала перадусім да „рэлігійных пачуцьцёў народаў“, якіх заклікала да „сьвятога крыжовага паходу“ проці бальшавікоў, бо яны, бачыце,—ня толькі забіваюць сваіх клясавых і палітычных ворагаў, але наагул ідуць проці Бога і хрысьціянскай царквы, „не даваляючы на аднэй пятай паверхні зямнога шара паўтараста мільёнам людзей навет маліцца Богу“... Гэткая прапаганда была скіравана перадусім у Амэрыку, дзе, як ведама, буржуазнае грамадзянства асабліва ўражліва на гэткія рэчы, бо прызвычаена да безгранічнай рэлігійнай толеранцыі... У значнай меры дзякуючы гэтай прапагандзе, Амэрыканскі ўрад адмаўляў прызнаньня Радаў... Пасьля гэтага ўсяго лёгка зразумець, што „Пасланьне“ галавы Праваслаўнай Царквы ў ССРР, які заяўляе ў дадатак, што — **на выпадак вайны—Царква будзе ўсімі сіламі і мерамі падтрымліваць радавую ўраду,**—адразу выбівае зусім не апошняй важнасьці і сілы аружжа з боку павадыраў арганізатара проці — радавага фронту.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Пратэст камуністычных паслоў Польшчы.

Камуністычныя паслы польскага сойму паслалі на імя амэрыканскага пасланьніка ў Варшаве гэткі пратэст проці судовага забойства Сакко і Ванцэтті:

„Камуністычная Пасольская Фракцыя шлець на рукі п. Амбасадара Злучаных Штатаў Паўночнае Амэрыі ў Польшчы — для Прэзыдэнта Куліджа—рашучы пратэст проці павольнага, трываючага доўгія гады, забіваньня двух рэвалюцыянераў - работнікаў італьянскіх, Сакко і Венцэтті, дамагаючыся безадкладнага звальненьня іх“.

Пратэст гэты быў высланы 18 жніўня—знача, да забойства Сакко і Ванцэтті.

Сойм мае быць склíканы.

Газэты паведамілі, што ўрад мае споўніць свой канстытуцыйны абавязак і склíкаць—на жаданьне паслоў—Сойм і Сэнат.

Сэсія мае мець характар **звычайнае:** парлямант меў-бы заняцца разглядам **бюджэту. Парлямант мае быць склíканы ў верасьні.**

Гэтая сэсія, пачатая ў верасьні, павінна будзе цягнуцца ня менш, як 5 месяцаў, каб скончыць разгляд ды прыняць „бюджэтны

Банкруцтва Лігі Народаў.

(Да справы выхаду з Лігі дэ-Жувэнэля).

Адмова францускага дэлегата Жувэнэля ад працы ў Ліве Народаў, а перадусім матывы гэтае адмовы — выклікалі страшэнную сэнсацыю — асабліва ў Парыжу і ў Лёндане.

Жувэнэль кажа, што ня хоча браць на сябе адказнасьці за бяссільную палітыку Брыяна, закідае Лізе скандальнае маўчаньне ў справе Кітаю; закідае тое, што Ліга ўхілілася ад разгляду канфлікту між Югаславіяй і Італіяй; паказывае на недарэчнасьць адносінаў Лігі да трактату між Радамі і Нямеччынай...

Наагул, Жувэнэль, кажа, што Лігі, праўду кажучы, ніякай няма, а ёсьць замест яе — „грубая чацьвёрка“, якая яшчэ і ў часе мірнай канфэрэнцыі вырашала ўсе справы „забываючы аб элемэнтарнай роўнасьці народаў“...

Цікаўна: Жувэнэль успомніў аб пагвалчанай „роўнасьці народаў“ амаль не ў 10-я ўгодкі стварэньня „Лігі Народаў“ — дзеля аховы гэтага гвалту! А калі ў Парыжу ў 1919 г. рэзалі „недзяржаўныя“ народы па жывым целе на кавалкі, ды сшывалі вэрсальскімі зялезнымі дротамі з чужымі — „дзяржаўнымі“, дык тады і ён маўчаў...

Слушна кажа ўстрывожаная француская ды ангельская прэса, што „паміж радкамі матываў п. Жувэнэля хаваецца нешта глыбейшае“... А што, дык — ці-ж цяжка зразумець? — „Хаваецца“, але-ж—усё больш відочная, ўсьцяж узрастаючая ды мацнеючая воля „недзяржаўных“ парэзаных народаў — да зьдзейсьненьня свайго права на самастойнае жыцьцё сярод іншых народаў...

Зараз жа пасьля апублікаваньня заявы п. Жувэнэля Брыян сабраў у сябе журналістаў, якім даў даўгі адказ на ўсе закіды Жувэнэля, бароячы перадусім сваю палітыку ў Лізе...

закон“... А вось Канстытуцыя кажа выразна, што якраз 20 лістапада, калі — 5 гадоў назад—адбылося першае паседжаньне Сойму, паслы і сэнатары аўтаматычна трацяць усе свае паўнамоцтвы... З гэтага ўсяго відаць, што ўрад, нарушаючы Канстытуцыю, хоча адначасна прадоўжыць паўнамоцтвы гэтага парляманту,—каб толькі не рабіць новых выбараў...

Трэба сказаць, што ўрад добра ведае „свой парлямант“: бо-ж пэўна проці прадоўжаньня сваіх паўнамоцтваў ды пэнсіяў паны паслы й сэнатары пратэставаць ня будуць!

Заграніцай.

Цікаўнае „запярэчаньне“ ангельскага прэм'ера.

Ангельскі прэм'ер Балдвін, бавячы ў Канадзе, выступіў з публічнай прамовай, у якой, паміж іншым, заявіў, што—„усе чуткі аб тым, быццам у Англіі насьпявае сацыяльная рэвалюцыя—хлусьня“... Ен рассыпаўся гарачымі камплімэнтамі па адрасу ангельскіх работнікаў, якія „з нязвычайным палітычным розумам ды мужэствам падыходзяць да вырашэньня ўсіх цяжкіх ды зложаных пытаньняў, што стаяць перад краем“...

Усё гэта—вельмі пекна. Але тое, што самаму прэм'еру прыходзіцца выступаць, дый яшчэ „заграніцай“ (прынамся—заграніцай Англіі, бо Канада—самастойная, роўная з Англіяй, частка Брытанскай Імпэрыі), з афіцыяльным запярэчаньнем насьпяваньня ў краі работніцкай рэвалюцыі,—гэта-ж ужо — скандал!.. Бо-ж, ведама, усякія „афіцыяльныя запярэчаньні“ заўсёды толькі пацьвярджаюць пярэчанае.

Урадавы крызіс у Ірляндыі „адкладзены“.

Урад Косгрэва, які — пасьля сваей „гэраічнай перамогі“ ў парляманьце (адным голасам!)—хацеў усё-ж выйсьці ў адстаўку, каб неяк перабудавацца — ужо на коаліцыйных падставах, у апошні мамэнт перадумаў. Замест гэтага, ён распусьціў да восені парлямант. У восені маюць адбыцца новыя выбары. Гэтак справа стварэньня новага парляманту і новага ўраду будзе аддадзена ў рукі народу.

Нячуваны націск Англіі на Латвію.

Як ведама, латвійскі ўрад зусім падрыхтаваў ужо тарговае і палітычнае паразуменьне з СССР, і ў хуткім часе маюць быць падпісаны абодва адпаведныя трактаты. Ведама і тое, як не да смаку гэтыя трактаты прыязьні між Латвіяй і яе магутным суседам—Англіі, якая хоча выкарыстаць Латвію, як „базу“ дзеля авантураў проці СССР.

Дык вась, Ангельскі ўрад дайшоў да таго, што загадаў, як пішуць газэты, свайму паслу ў Рызе афіцыяльна заявіць латвійскаму ўраду, што — „ратыфікацыю Латвійскім Парлямантам трактату з Радамі Англія будзе лічыць варожым крокам проці Англіі“.

Ня ведаем, як міністар заграхічных спраў Латвіі адказаў ангельскаму паслу на гэтую яго спробу „дыктаваць сувэрэннаму парляманту Рэспублікі загады ангельскага ўраду“. А варта было-б, каб сацыялістычны ўрад Латвіі — даў добрую навуку абнаглеўшай ужо да апошняй меры ангельскай буржуазіі.

Ці-ж капітуляцыя Літоўскага ўраду ў справе Вільні.

Цікаўныя весткі ідуць з Літвы. Урад яе круціцца паміж жаданьнем завязаць зносіны з Польшчай — на чым асабліва націскаюць Англія і Францыя, а — з другога боку — неахвотай зрачыся Вільні, аб звароце якой польскі ўрад і слухаць ня хоча... Але тут якраз прыйшоў на помач... рымскі папа! Пасьля вострага канфлікту папярэдняга літоўскага ўраду (—навет „хрысьцьянскіх дэмакратаў“!) з Папай—за тое, што ён—у Канкардаце з Польшчай — прызнаў віленскую эпархію (дыэцэзію) належачай да Польшчы,— цяпер новы літоўскі ўрад пачаў перагаворы з Рымам у справе Канкардату з Літвой. І вось, у справе гэтага Канкардату (умовы) сам прэм. Вальдэмарас мае прыехаць да папы ў Рым. Але цяпер ужо літоўскі ўрад неяк „адлажыў на бок“ свой стары гнеў на папу за аддачу Віленшчыны Польшчы і мае весьці перагаворы, абмінаючы справу Вільні.

Урадавая прэса ў Коўні піша, што ад рымскага папы не залежыць палітычна прызнаньне ці няпрызнаньне польскага захвату: Касьцёл, бачыце, толькі рупіцца аб арганізацыі царкоўнага ды рэлігійнага жыцьця веруючых...

Якое „зьмяньшэньне акупацыі“ хоча зрабіць Францыя.

Газэты пішуць, што паміж ангельскім і францускім урадам ідзе ўсьцяж спорка аб тым, на сколькі зьменшыць акупацыю нямецкай зямлі войскамі Антанты.

Ангельскі ўрад быццам трэбуе, каб Францыя вывела з Нямеччыны 11 тысяч жаўнераў, тады Англія з Бэльгіяй зьменшаць свае акупацыйныя атрады кожная на 1.500 жаўнераў. Францускі ўрад быццам заявіў ангельскаму так: хай сабе Англія і Бэльгія робяць з сваімі атрадамі, што яны хочуць; але Францыя пакіне ў Нямеччыне ня менш, як 50 тысяч жаўнераў (цяпер францускіх войск у Нямеччыне аж 55.000!).— Добрае „Лёкарно“, няма што казаць...

Але, відаць, Англія ды Нямеччына націскаюць вельмі сільна, бо-ж афіцыёз францускага ўраду „Тан“ друкуе вельмі жаласную стацьцю, скіраваную да ангельскага ўраду, у якой прыпамінае, якое важнае значэньне мае для... эўрапэйскага міру й ладу згода і „сардэчнае паразуменьне“ між Англіяй і Францыяй, і... якія страшэнныя рэчы рабіліся заўсёды ў Эўропе, як толькі яны пачыналі расхадзіцца...

Нямеччына адбудоўвае свой флёт.

На нямецкіх доках вядуцца энэргічныя работы—па адбудове марскога флёту. Толькі што спушчаны ў воду трэці браняносец, адбудаваны пасьля міру, а ўвосені мае быць гатовы ўжо й чацьверты. Апрача таго, збудаваны ўжо шмат мінаносцаў.

Сэрбска-баўгарскае збліжэньне.

Пасьля векавой ненавісьці, якая выклікала некалькі вельмі жорсткіх ды крывавых войнаў, ды ў свой чарод жывілася гэтымі жорсткімі, часта правакаванымі то Аўстрыяй, то Расеяй войнамі,—наступіла нячуванае збліжэньне між братнімі народамі—сэрбскім і баўгарскім. Выяўленьнем гэтага збліжэньня, патрэбу якога пачула раптам першая Югаславія — пад пагрозай разгрому з боку Італіі, зьявіліся перагаворы ў справе заключэньня тарговага трактату. Але прэса абодвух краёў шырока падхапіла справу, ды наглыбляе прыязныя настроі сярод грамадзянства. Баўгарская прэса дайшла навет да таго, што высунула думку аб стварэньні „злучанага каралеўства—Баўгара-Сэрба-Харватыі“—пад адным супольным каралём, цяперашнім галавой Югаславіі Аляксандрам, на карысьць якога быццам навет мае зрачыся бацькаўскага трону сучасны кароль Баўгарыі Барыс... Баўгарскае афіцыяльнае агенцтва, ведама-ж, зараз-жа запярэчыла гэткай фантастычнай думцы. Але настроі збліжэньня растуць далей, і баўгарская газэта „Мір“ высунула яшчэ больш цікаўную думку — аб стварэньні Вялікай Балканскай, ці Паўдзённа-Славянскай, Імпэрыі—на ўзор былай Германскай, у склад якой мелі-б увайсьці: Сэрбія, Баўгарыя, Харватыя, Славенія, Босьнія, Гэрцэгавіна, Чарнагорыя, Далматыя і Македонія,—усе на роўных правох як самастойныя дзяржаўна-праўныя адзінкі...

Праект цікаўны, але — ясна-ж — да зьдзейсьненьня яго, пэўне-ж, не дапусьцяць „вялікія міратворцы“ Эўропы, якія заўсёды спэкулявалі на міжнародавых сварках на Балканах!

Паўстаньне чырвонаскурых у Балівіі.

Паўстаньне чырвонаскурых у Балівіі аказалася значна паважнейшым, як спадзяваліся ды як прадстаўлялі гэта ўрадавыя інфармацыі. Уся паўдзённая траціна краю знаходзіцца пад уладай паўстаўшых, якія здолелі ўжо акружыць ды абязброіць усе ўрадавыя войскі на захопленай тэрыторыі. З цэнтру высланы новыя войскі, але цяпер з паўстанцамі трэба ўжо весьці запраўдную вайну, як з добра азброенай ды рэгулярнай арміяй.

Захацелася лепшага чалавечага жыцьця і чырвонаскурым, якіх дагэтуль разглядалі тэарэтычна „вучоныя“, як—„ніжэйшую расу“, а практычныя „палітыкі“—папросту зьнішчалі масова, не забываючыся вызысківаць, як скаціну безгалосую...

На кітайскім тэатры вайны.

Вестка аб узяцьці Нанкіну паўночнымі войскамі аказалася перадчаснай. Пад Нанкінам палажэньне — без перамен: паўночная армія ўсьцяж бамбардуе прадмесьце й места Нанкін, але паўдзённая артылерыя стрымлівае яе далейшы рух. Характэрна адкрытае ўчасьце ангельскіх ваенных караблёў у баёх—на баку, зразумела, паўночнай арміі: ангельскія караблі бамбардуюць галоўным чынам караблі паўдзённай арміі ды высаджываюць сухапутныя атрады—зразумела-ж „дзеля аховы ангельскіх грамадзян“...

Цікаўную вестку падало амэрыканскае агенцтва.—Яно кажа, што нанкінскі ўрад — з пачыну левага крыла Куо-Мін Тангу (кітайскіх „камуністаў“) пастанавіў бараніць Нанкін усемі сіламі... Адначасна ім выдана адозва аб тым, што ханькоўскі ўрад і Выканаўчы Камітэт Куо-Мін-Тангу мае пераехаць з Ханькоў у Нанкін.—Гэтым злучаны Нанкінска-Ханькоўскі Урад мае, відаць, паклікаць да супольнай акцыі шырокія масы народу, адбудаваўшы ізноў адзіны сацыяльна-нацыянальны фронт усенароднай барацьбы за вызваленьне...

Спыненьне наступленьня паўночных арміяў.

Палажаньне паўдзённых арміяў хутка наляпшаецца. Перадусім новаму паразуменьню ў Куо-Мін-Тангу ўдалося арганізаваць рашучую абарону Нанкіна, у выніку чаго места ўжо можа лічыцца адратваным ад небясьпекі з боку арміі Паўночы. Далей, усе спробы гэтай арміі перайсьці Жоўтую раку адбіты артылерыяй арміі Поўдня, якая раптам адрадзіла свой дух і сваю сілу... Артылерыя гэта, разьмешчаная на гарах з усходу ад Нанкіна, паралізуе ўсе рухі арміі Паўночы. — Апошняя, аднак-жа, робіць у месьце значныя шкоды, бамбардуючы яго ўсьцяж.

Пэпэсы у апазыцыі.

Пэпэсы патроху ўсё больш „адбіваюцца ад рук“, бо-ж пачалі ўжо ня толькі крытыкаваць паноў міністраў, але навет, навет зачапляць і самага старшыню Рады Міністраў—марш. Пілсудскага...

У адным з апошніх нумароў „Роботніка“ зьмешчаны цікаўны артыкул старога пэпэсаўца, таварыша Язэпа Пілсудскага, пасла Дыяманда,—аднаго з найвялікшых, але і найспакайнейш „дыямантаў“ (брыльянтаў) ППС.

У гэтым артыкуле аўтар востра зьдзекуецца над тымі „пілсудчыкамі“, якія абвясьцілі марш. Пілсудскага „водзэм“ народу і лічаць гэта за вялікае шчасьце для Польшчы... Аўтар кажа, што часы гэтых „водзув“ у культурнай Эўропе даўным-даўно мінулі, што культурныя, арганізаваныя гаспадарча і праўна, заходнія грамадзянствы даўно ўжо не даюць ходу „фантазіям“ гэткіх „водзув“— круціць дзяржавай ды народам, як ім, гэтым „павадыром“, стрэльне ў галаву... Часы Кромвэляў і Напалеонаў на культурным Заходзе даўно скончыліся! Толькі ў адсталай культурна Італіі можа цяпер рабіць, што захоча, такі „вудз“ Мусоліні... Такімі „водзамі“ поўны яшчэ Балканы, ня кажучы аб далейшым Усходзе. „Калі ў Польшчы няма талентаў, няма вялікіх палітычных розумаў, дык на гэта не парадзіш самавольнай формай ураду; а калі яны ёсьць, дык пэўна ім ня стане на перашкодзе праўны лад ды канстытуцыйная форма ўрадаў“.

Аўтар кажа, што „аб палітычных сымпатыях“ цяпер (у клясавым выразна грамадзянстве) рашае клясавае становішча „павадыра“...—Дык і сучасны „вудз“ у Польшчы, калі і „заўладаў душамі“ каго колечы, — як заяўляюць „пілсудчыкі“,—дык ужо зусім не работніцкімі, але хіба-ж—проціработніцкімі...

З прычыны гэтага артыкулу ў тым-жа „Роботніку“ праз колькі дзён была зьмешчана перадавіца, у якой, паміж іншым, сьцьвярджаецца, што „тав. Дыяманд закрануў пытаньне вялікай вагі ды нязьмерна на часе ў сучасны мамэнт, асабліва—ў „пасьлямаёвай Польшчы“... Агульны практычны вывад з артыкулу п. Дыяманда „Роботнік“ робіць такі: „Падзел Грамадзянства (ведама-ж: польскага, сучаснага) на прыхільнікаў і праціўнікаў „водза“ (чужаслоў „Роботнікаа“) ёсьць падзелам яго на ворагаў дэмакратыі і яе прыяцеляў...

Так і запішам!

Але далей—няменш цікаўна.

„Якія-б ні былі матывы й мэты „павадырства“, рэзультат іх заўсёды — адзін і той самы: параліжаваньне самадзейнасьці масаў, забіваньне ў масах і адзінках крытычнага (сьведамага) адношаньня да акружаючага сьвету. „Вудз“—неабмыльны, дык ты, грамадзінін, пільнуй сваіх хатніх сямейных справаў, даравляйся, а рэшту пакінь „павадыру“... Гэткая „балвахвальчая“ ідэалёгія „павадырства“ супольна роўна фашыстам эндэкам, ды маёвым санатарам (пілсудчыкам)...

Вось, вось.—А яшчэ, здавалася, так нядаўна красамоўны, мілагучны, далікатны пасол Недзялковскі з шляхотным перакананьнем—ад імя ППС—жыраваў вэксалі „маёвага перавароту“—перад Эўропай, даводзячы на кангрэсе II Інтэрнацыяналу, што ў Польшчы няма ніякага фашызму, што край навет ня ведае, што такое нейкая там дыктатура. „Жывем папросту — пад перавагай адзінкі“, але—„з захаваньнем у поўнасьці канстытуцыйных формаў“, — клясычна фармуляваў тады п. Недзялковскі тую самую „хатня-сямейную ідэалёгію“, якую цяпер так, кляйміць яго ўласная ППС...

Дарэчы: дзе-ж падзеўся цяпер гэты далікатны панок — пасьля таго, як наплакаўся ўволю ў камізэльку марш. Пілсудскага?! — Чаму ня піша больш сваіх пекных перадавіц у „Роботніку“, якога, здаецца, быў выбраным „рэдактарам начэльным“?!

Хутка ідуць часы-падзеі ў Польшчы... Куды вось толькі зайдуць, ды куды завядуць бедных пэпэсаў?!

Не заусёды.

Не заўсёды ў небе хмары;
Міг—ні хмарачкі кругом!
Сонца ў красках на папары
Усьміхнулася жыцьцём.
Не заўсёды пяруністы
Над зямлёю б'е грымот,
Не заўсёды цёмналісты
Гнецца бураю чарот.
Сьціхне ветру скавытаньне,
І красой спакойнай дня
Прыгажэй, чароўней гляне
Сінім бліскам вышыня.
Так і сэрцу не заўсёды
У хмарах роспачы тужыць:
Душа рвецца да свабоды,
Маладая—хоча жыць!
Душа просіцца на волю,
Прагне лепшага ў жыцьці,
Ды—чым век цярпець нядолю—
Лепш адзін раз памярці...
Памярці—не бескарысна:
Каб ахвяраю сваёй
Зьнішчыць хмару пяруністу
Над радзімаю зямлёй.

Міхась Васілёк.

ТРЫАЛЕТ.

(З беларускага жыцьця).

Дух ваш—рымскі і маскоўскі:
Сель-саюзьнікі, хадэкі!
Знаема вас: хто такоўскі!—
Дух ваш—рымскі і маскоўскі...

Паўлюкевіч, Умястоўскі
Чмуцяць з польскае апекі;
Дух-ваш рымскі і маскоўскі—
Сель-саюзьнікі, хадэкі!—

1927 г. Га—Ле.

ХРОНІКА.

Госьці з Радавае Беларусі. У Варшаву прыехалі з Радавае Беларусі — у навукова-дасьледчых мэтах — Народны Камісар Зямляробства Беларусі і праф. Г. Гарэцкі. Апошні, як ведама, прыяжджаў у Польшчу і ў леташнім годзе і тады-ж наведаўся й у Вільню.

Пэтыцыя сялян Жодзіскае парахвіі. Сяляне Жодзіскае парахвіі паслалі да Прэзыдэнта Рэспублікі пэтыцыю, просячы звольніць з вастрогу жодзіскага пробашча, ведамага беларускага нацыянальнага барацьбіта, кс. Гадлеўскага, які засуджаны судом за беларускую ведама-ж: „антыпаньствовую“! — працу на два гады ў вастрог, ды цяпер адбывае гэту кару.

На пэтыцыі—некалькі тысячаў подпісаў.

Абшарнікі наягалі. Пададзеная намі з „Слова“ вестка аб тым, быццам пасол Рагуля і сэнатар Назарэўскі перайшлі да абозу „полёнофілаў“ Паўлюкевіча, як заяўляе сама рэдакцыя абшарніцкай газэты, нязгодна з праўдай. Паўлюкевіч быццам заявіў, што прыём Рагулі ў „полёнофілы“ — немагчымы,—але магчыма, што нехта з „полёнофілаў“ вёў на сваю руку перагаворы аб гэтым з Рагуляй і Назарэўскім.

Паўтараем: трэба чакаць выясьненьня ад самых Рагулі й Назарэўскага, бо-ж і „перагаворы“ часамі кампрамітуюць...

Агіда. Навет польская прэса мусіла заклеймічь агіднае наступаньне дзікога фанатыка кс. Бародзіча ў Леопалі. Газэты падаюць цэлы рад агідных фактаў гвалтаў гэнага дзікуна над праваслаўным беларускім насяленьнем, на якія адміністрацыйныя ўлады не зварачаюць увагі. „Кур. Віл“. проста абвінавачывае кс. Бародзіча ў сьвядомым правакаваньні рэлігійнае калатні — ажно да бойкі — паміж праваслаўнымі і каталікамі. Навет абшарніцкае „Слово“ абурана дзеяльнасьцяй гэтага „слугі божага“, які пачувае сябе ў Польскай „дэмакратычнай“ рэспубліцы 20 га веку таксама, як трыста гадоў назад пачувалі сябе розныя Кунцэвічы і іншыя фанатыкі каталіцтва.

На тое-ж — конкордат...

Цікаўная на нашы часы памятка. У адным з нумароў нашае газэты мы падалі вестку аб конкурсе драматычных труп у Горадні, на якім Гурток Т-ва Беларускае Школы ў Горадні атрымаў II нагроду — дыплём. Гэты дыплём прысланы на сховы — у Беларускі Музэй ім. Ів. Луцкевіча ў Вільні. Прыхіляючыся да просьбы гарадзенцаў, зьмяшчаем тэкст гэтага дыплёму ў польскай мове, у якой ён напісаны:

DYPLOM.

Postanowieniem Juri, wydane 2-go lipca 1927 r. podczas konkursowego przedstawienia w Grodzieńskim Teatrze Miejskim amatorskich Dramatycznych Towarzystw miasta Grodna, a mianowicie: Białoruskiego, Żydowskiego, Polskiego, Rosyjskiego i Ukraińskiego, — Białoruskiej Dramatycznej Sekcji przy Grodzieńskim Hurtku T-wa Białoruskiej Szkoły, została przysądzona Druga Nagroda za artystyczne wykonanie sztuki „Lekary i leki“, składająca się z niniejszego dyplomu z nadaniem prawa noszenia medalików dla tych, którzy wzięli udział w tej sztuce, jako wykonawcy, z nadpisem „II-a Nagroda za Udział w Konkursowem Przedstawieniu 2-go lipca 1927 roku w m. Grodnie“.

Członkowie Juri:
Wojciech Dąbrowski
Walerjan Molkewicz
Сьцяпан Балдоўскі
Аляксандар Чашко
D. Berezowski.

Grodno, dnia 3-go lipca 1927 r.

З курсаў у Радашкавічах.

Паводле расказаў прыехаўшых з курсаў вучыцялёў,—лекцыі чыталіся трымя лектарамі: Сьвяневічам, Выслоўхам і Вандай Малілан. Курсы адведаў візытатар сярэдніх школ Віленскага Куратарыума Рыс, які зрабіў рэпэтыцыю пазнаньняў слухачоў, ды быў вынікамі яе вельмі здаволены.

Аб карысьцях праслуханьня курсаў самі вучыцялі гавораць:

Курсы, апрача карысьці ад праслуханьня лекцыяў, аказаліся карыснымі і з таго боку, што далі магчымасьць беларускім вучыцялём сярэдніх школ пазнаць адзін аднаго, зблізілі іх між сабою і далі грунт для больш цеснага супрацоўніцтва на далейшы час.

Падчас гутарак і спэцыяльных нарадаў усталена пэўнае паразуменьне аб праграмах паасобных прадметаў, мэтадаў навучаньня і г. д. У прыватных гутарках было парушана пытаньне аб палажэньні беларускага вучыцельства сярэдніх школ наагул, адносіньне да вучыцельскага саюзу, які вясною пачаў арганізавацца, а таксама выявілася жаданьне вучыцельства мець друкаваны пэдагагічны орган.

Па думцы прыехаўшых, курсы яшчэ карысны, як пэўны адпачынак ад чарговае працы сярод вясковае прыроды. Дзякуючы прысутнасьці ў Радашкавічах гр. Вітта і пры яго дапамозе, былі наладжаны гульні з мячом, якія былі ацэнены, як паважны пэдагагічны фактар, які вучыцельства пастанавіла ўжыць у час пазьнейшых заняткаў з вучнямі.

Справа пасла С. Барана.

(*Пісьмо ў Рэдакцыю*).

Паважаны грам. Рэдактар!

З розных старон да мяне зьвяртаюцца, каб паінфармаваць, у якім палажэньні знаходзіцца ў сучасны момант мая справа.

Каб зьбегнуць розных вэрсый, прашу не адмовіць надрукаваць у Вашай газэце „Наша Праўда“ наступнае:

„У 1923 годзе, я быў засуджаны Акружным Судом за нібы-то прыналежнасьць да сьпіску, які меў за заданьне, дарогай збройнага паўстаньня, стварыць Беларускую Рэспубліку,—з арт. 101 К. К.—на шэсьць гадоў катаргі, а з арт. 102 К. К. — на 4 гады катаргі.

Суд Апэляцыйны адкінуў арт. 101 К. К., пазаставіўшы ў сіле чатыры гады кары, з арт. 102 К. К.

Кару гэту я адседзеў у працягу трох гадоў і сямі месяцаў, а пазастаўшую кару—Прэзыдэнт завесіў на пяць гадоў (т. наз. амнэстыя)—не вярнуўшы правоў.

Такім чынам мяне звольнілі з турмы, але, ня маючы правоў — я стаўся „жывым трупам“.

Гэта, што да фактаў звальненьня з турмы.

Цяпер пазволю сабе напісаць некалькі слоў аб самым працэсе:

Пры разглядзе справы ў Судзе, я заявіў, што я працаваў для добра свайго народу і змагаўся за яго незалежнасьць, бо гэта ёсьць мая ідэя і права кожнага народа, але я ніколі ня меў нічога супольнага з „атаманам“ Разумовічам-Хмараю і да ягонае арганізацыі не належаў і адпавядаць за іх чыны не магу.

Але мяне асудзілі. Асудзілі не на падставе канкрэтных дадзеных, а на падставе прыпушчаньні і опініі, якую мне зрабілі мае „прыяцелі“.

Галоўны сьведка Ленкевіч, які працаваў з Разумовічам, а потым выдаў усіх, атрымаўшы за гэта агента паліцыі, сцьвердзіў на Судзе, што я не належаў да гэтае арганізацыі, але ён чуў мае прозьвішча як паэта, які піша вершы. (У Суд. Сьледав. ён саўсім не ўспамінаў аба мне) і ня гледзячы на гэта—мяне асудзілі.

Я ведаў, што ў гэтым працэсе прапуюць нейкія цёмные сілы, якім я быў не пажаданны і яны усімі сіламі стараліся мяне „зьліквідаваць“, але ня маючы дадзеных, я абсалютна ня меў магчымасьці іх выкрыць.

І вось цяпер толькі мне ўдалося выкрыць тую ніць „інспіратараў“, аб якіх я ня ведаў пад час судовай расправы, як роўна-ж і ня мог ведаць аб гэтым Суд.

Аб гэтых матарыялах я паведаміў Міністэрства Справядлівасьці, дамагаючыся расследаваньня і скіраваньня маей справы ў Найвышэйшы Суд для новага разгляду справы.

Міністэрства Справядлівасьці мяне паведаміла лістам № 4568/27 ад 3 жніўня месяца г. г., што гэтай справе дадзены бег.

Ці будзе разглядацца справа паноўна і калі і ці новыя дадзеныя будуць узяты пад увагу, аб гэтым я ня ведаю.

Думаю, што ў хуткім часе гэта справа вырашыцца“.

Вось усё, што ёсьць конкрэтнага ў маей справе.

Прашу прыняць выразы глыбокае пашаны

С. Баран.

Горадня, 20 жніўня 1927 г.

Да нашых падпішчыкў.

Пасылаючы рахункі, просім пав. грам. Падпішчыкаў урэгуляваць падпісную плату.

Хто да 1 кастрычніка не ўрэгулюе падпісной платы, або ня прышле паведамленьня, што грошы будуць прысланы, таму высылка газэты будзе спынена. **Адміністрацыя.**

Выбары у Самаўрады.

Скідэльская гміна.

(Горадзеншчына).

Ня зусім на апошнім мейсцы, у культурна-палітычным асьведамленьні, стаіць сялянства нашае гміны, дзякуючы гэтаму адыграла вялікую ролю пры выбарах у самаўрад і дала зразумець паном ды панскім падлізьнікам, што сьвядомасьць сялянства яго пачуцьцё салідарнасьці і еднасьці, гэта тая вялізарная магутная скала, якую ані жадныя махінацыі, ані хітрыкі паноў ня здолеюць ня толькі разьбіць, але навет і прыступіцца да яе блізка. Выбары адбыліся 3 жніўня. Спачатку справа выглядала досыць небясьпечна. Выявіўся, дзякуючы нейкаму прайдзісьвету, агітаваўшаму пры выбарах да Сойму за „Вызваленьне“ побач з сялянскім левым сьпіскам № 2, другі сьпісак, таксама выключна з сялян, за выняткам „штук колькі“ панкоў. Пачаліся бурныя спрэчкі, які з двох сьпіскаў павінна прыняць сялянства. Усьміхаліся паны, стаючы на гмінным ганку, ды з задаваленьнем пацiралі сабе рукі, што вось, вось сяляне разаб'юцца на дзьве групы, гэткім чынам даючы магчымасьць прапаўзьці па адным з гэтым сьпіскаў вызначаным там панкам абшарнікам. Раптам на самакаце зьяўляецца нейкі кучаравы мардасты ў сярэдніх гадох пан, які (па чуткам) прымаў чыннае ўчасьце пры выбарах, амаль-што ня ў кожнай гміне нашага павету і пачынае па разейску „загінаць“ гарачую прамову, што толькі прышпіліўшы да свайго сьпіска штук колькі паноў, вы будзеце пэўныя, што гэты сьпісак ня будзе мець жадных перашкод з боку (?) ды, як па масьле праедзеце... (каб было добра і нашым і вашым). Зразумелі сяляне гэтыя лоўкія панскія штукі і, як адзін, рашуча адмовіліся (пасадзіўшы бязумоўна пана прамоўцу проста з „rowera“ ў калёшу) нат' быць кандыдатамі ў здрадніцкім сьпіску, а галасаваць за адзіны сялянскі левы сьпісак. Спахмурнелі паны (бач неўдаецца), пачалі клеіць свае сьпіскі, якіх раптам стала ўсіх аж-но пяць. Ды як лоўка: — на першым пляне выставілі, вядома-ж, сваю кандыдатуру, а далей, дзе якога знаёмага па фаміліі селяніна намацаюць, сунуць яго ў свой сьпісак на апошняе месца. Гэткім чынам спадзяючыся, што тыя сяляне, якія стаяць у іхнім сьпіску — напэўна пададуць свой голас за іх — так спрытна і проста на сялянскім карку праехаць у рай. Між тым брахуны-лізунчыкі, што ліжуць паноў ад пят і вышэй да пэўнага мейсца, рабілі сваю агідную работу, падбунтоўваючы сялян, папаўшых у іхныя сьпіскі, галасаваць толькі за іх. Але не — фіга з макам, апякліся й тут! Я знаю, кажа стары дзядзька, дзеля чаго яны мяне там увапхнулі; няхай пацешацца, мая фамілія ім так падабаецца, а я буду галасаваць за свой — сялянскі. Адчытваючы сьпіскі, п. староста адразу выкрэсьліў кандыдатуру аднаго самага ідэйнага селяніна, які стаяў другім кандыдатам па сьпіску, за палітычную судовую справу з працэсу „65“, хаця-ж ён пракуратурай і быў апраўданы. На яго мейсца сяляне ўсё-ж вызначылі свайго адпаведнага чалавека.

Рэзультаты выбараў гэткія: № 1 (урадавы) атрымаў 2 мандаты, з іх адзін беларус былы войт, які заслугоўвае пашаны з боку грамадзянства, другі паляк(?). Сьпісак № 2 (сялянскі левы) 11 мандатаў, № 3 і 4 — па дзьве бульбы... і № 5 адзін мандат — беларус. Гэткім чынам прайшло агульным лікам 13 беларусаў і адзін каталік, які лічыць сябе паляком, нейкі п. Гамулецкі, мецiўшы з прагавітай зайздрасьцю ўжо даўно ўсесьці на „лоно“ вуйга. Але панок супроць ветру ня дзьмухнеш.

Вітаю Вас, сяляне, барацьбіты за лепшую будучыну і паляпшэньне сучаснага гаротнага жыцьця нашага сярмяжнага загнанага нудным лёсам люду. Вялікую і адпаведную працу даручылі вам вашыя браты, спадзяючыся, што вы выпаўніце свой грамадзкі абавязак так, як падабае гэта зрабіць шчырым змагаром сялянска работніцкай ідэалёгii — вітаю вас! **В.**

Выбары ў гмінную раду.

(Гарадок Беластоцкі).

Скончылася і ў нас панаваньне старай гміннай рады. Хаця-ж вынікамі выбараў новай рады мы ня зусім здаволены, але-ж усё-ж такі, ёсьць моцная надзея, што нашы сялянска-работніцкія інтарэсы ня будуць у такой пагардзе, у якой былі да гэтага часу.

Сяляне сумесна з фабрычнымі работнікамі па аднаму сьпіску правялі 6 кандыдатаў, а другія 6 кандыдатаў правялі жыды, пераважна прамыслоўцы. Трэба адзначыць, што галоўная віна ў такіх выніках ляжыць на нас саміх, на нашай несьвядомасьці. Замест таго, каб дружнай грамадой прыйсьці на выбары і чакаць іх, шмат якія вёскі, як Залукі, Кялодна, Пераходы, Даўнева і інш. не дачакаўшыся галасаваньня, паразыходзіліся. Відаць, спалохаліся, што не ў пару паабедаюць і паслабеюць. І толькі вось, гэтым вы далі, грамадзяне, магчымасьць прамыслоўцам правясьці палову сваіх кандыдатаў. Пара ўжо ўцяміць, што толькі мы самі можам выкаваць сабе лепшую будучыню. Цяпер чакаем выбараў войта. Прамыслоўцы выставілі на войта асадніка-прамыслоўца, які пры выбарах у раду праваліўся. Але нашы выбранцы павінны моцна стаяць, што толькі войт, выйшаўшы з сялянскае ці работніцкае хаты, будзе бараніць нашы інтарэсы і што толькі такому войту мы сяляне і работнікі можам давяраць. **Селянін.**

Выбары ў Ваўкавыскую мястовую раду.

31-га ліпня с. г. адбыліся выбары у мястовую раду. Было выстаўлена 11 сьпіскаў. Трэба было выбраць 24 радных.

Асабліва напружаную агітацыю перад выбарамі вялі жыды, паны і П. П. С. Усё прайшло-б ціха, каб не адзін агідны ўчынак пана абшарніка Паплаўскага, які ў „liście otwartym“ абвінаваціў кандыдата ў радныя былага грамадаўца П. Міхальчука ў камунізьме, быццам ён у 1920 г. браў у ім чынны ўдзел. Грам. Міхальчук, ня хочучы, каб зусім уняважнілі сьпісак, па якому ішоў, зьняў сваю кандыдатуру і ў адкрытым лісьце даў адказ п. Паплаўскаму, цягнучы яго пад суд. Але, ня гледзячы на ўсе стараньні паноў, усё-ж такі Ваўкавыская рада мае аднаго раднага беларуса. Найбольшы лік мандатаў, бо аж 11, узялі жыды. П. П. С. атрымалі 5 мандатаў, мяшчанскі сьпісак — 5 мандатаў, польска-шляхоцкі — 2 мандаты.

Выбаршчык.

Працоўныя беларусы на сваіх пазіцыях.

(Горадзенскі пав.).

11-га жніўня адбыліся апошнія выбары ў Горадзенскім павеце ў Берштанскую Гмінную Раду. У выбарах брала ўчасьце 145 сяброў, выбраных з паасобных абводаў гміны. На агульны лік 14 радных, якія будуць кіраваць гміннай гаспадаркай, выбраныя **13 нацыянальна і клясова сьведамых працоўных беларусаў** і адзін шляхцюк (стары войт).

29 і 30 ліпня амаль не такія самыя вынікі далі выбары ў Луньне і Дубне: прайшлі ў вялікай большасьці працоўныя беларусы.

Молат.

Як у нас адбываліся выбары ў гмінную раду.

(Камаі, Сьвянцянскі павет).

Выбары сяброў гміннага сабраньня адбыліся 12-га чэрвеня, а выбары гміннай рады адбыліся 26-га чэрвеня. У нядзелю, як ведама, сьвятам усе выбаршчыкі сабраліся да касьцёла (у нас за малымі выняткамі ўсе каталікі). А гадзіне 4 й пачаліся выбары. Ад самага раньня хадзілі чуткі, што паны нешта хочуць зрабіць, каб пралезьці і кіраваць радай, а ксёндз у касьцёле казаў выбраць—двух разумных людзей. Гэтыя словы паказаліся нам сьмешнымі, бо хто-ж будзе выбіраць дурня. Але калі пачаліся выбары, то выявілася, што тут ня сьмешкі, а запраўды ў нас усе „дурні“. З пачатку выбараў пачалі ўкладаць сьпіскі кандыдатаў. У нас ёсьць 12 абводаў, трэба выбраць 12 радных. Сабраньне пачало дамагацца, каб ад кожнага абводу быў радны. Выбарная камісія з гэтым згадзілася: Выбралі 12 радных і 12 заступнікаў. Здавалася, што тут ужо і канец, але дзе там! Выбарная камісія зьмясьціла на адзін сьпісак усіх радных, на другі заступнікаў і загадала гэтыя сьпіскі падпісаць некалькі сябрам сабраньня, а калі гэта было зроблена, тады толькі паны паказалі „свае абліча“. Вывесілі нашы абодва сьпіскі на сьценку пад № 1 і 2, а пад № 3 і 4, два дадатковыя „маленькія“ па 3—4 чалавекі і загадалі галасаваць. Нашы сяляне ўбачыўшы абман, таму, што на дадатковых сьпісках на першым месцы стаялі ксёндз і абшарнік Чэховіч, галасоў не падалі, кажучы, што мы выбралі 12 радных і 12 заступнікаў і за іх рукі і ногі падымем, а больш нам нікога ня трэба, і разышліся, а праз гэта выбары і не адбыліся.

Такім чынам выявілася, што ў нас толькі ксёндз і абшарнік Чэховіч разумныя, а рэшта ўсе дурні, што можна зразумець са слоў ксяндза, якія ён сказаў у касьцёле. Што будзе далей і калі будуць выбары, ня ведаем. **Сябра сабраньня.**

Карэспандэнцыі.

Культурнае жыцьцё нашае вёскі.

(в. Бэршты, Горадзенскага пав.).

У барацьбе за свае культурныя здабычы працоўныя беларусы нашае вёскі, сябры Т-ва Беларускае Школы, крок за крокам ідуць уперад, нясучы нашаму шматпакутнаму народу сьвятло знаньня, зьбіваючы з яго ланцугі духовага рабства і векавога культурнага заняпаду, ды выклікаючы ў яго нацыянальнае пачуцьцё, заахвочваючы яго да працы на культурна-асьветным полі. Дык чэсьць і слава сябру Т-ва Беларускае Школы, Мікалаю Касьцевіву, сьвядомаму барацьбіту з цемрай, які сваей упорнай працай здолеў заахвоціць другіх сяброў да культурна-асьветнае працы на карысьць свайго народу і які за малы працяг часу здолеў зладзіць 36 спэктакляў у сваей вёсцы, іграючы што-тыдня новыя і новыя п'есы. Здаецца, ужо няма такой беларускай п'есы, якой-бы ў гэтай вёсцы ня гулялі. Дык няхай за гэтым добрым прыкладам пойдуць сябры і другіх вёсак, няхай творчы агонь запаліць іх маладыя сэрцы і няхай у нашым павеце ня будзе ніводнае вёскі, дзе-бы ня ладзілі спэктаклі.

Да працы сябры! **Молат.**

Спэктакль на вёсцы.

10 га ліпня г. г. у в. Маслава, Міжэвіцкае воласьці, Слонімскага павету, гуртком Т-ва Беларускае Школы быў наладжаны спэктакль. Згулялі п'есы „Заручыны Паўлінкі“—Аляхновіча і „Зьбянтэжаны Саўка“ — Родзевіча. Гулялі надта добра. Прымаючы пад увагу летні час, уваход быў бясплатны. Прысутных было больш за 200 асоб. Усе надта зацікавіліся прадстаўленьнем, аб чым сьведчаць гучныя воплескі і здаровы сьмех глядзельнікаў. Відаць, што культурная праца ў вёсцы распачалася, і трэба толькі пажадаць ёй як найхутчэйшага разьвіцьця. **Х.**

Усячына.

Дошкі бяз сучкоў.

Сучкі ў дошках значна зьніжаюць іх якасьць, як будаўнічага матар'ялу. А таму вялікую цікавасьць прыцягнуў да сябе нядаўна надуманы ў Амэрыцы апарат, які вырэзвае сучкі з дошчак і замяняе іх акуратна дапасаванай плянкай. Прылада гэта такая простая, што навет падростак лёгка спраўляецца з ёй, вырэзваючы ад 60 да 90 сучкоў у гадзіну з дошчак да 3-х цаляў у таўшчыню і залатваючы дзіркі пасьля гэтых сучкоў. Клей пры гэтай апэрацыі непатрэбен, сырая дошка ссыхаецца наўкол устаўленага кавалка, не каробячыся і ня трэскаючыся.

Скандал у ірляндзкім парляманьце.

Нашы чытачы ведаюць, што на апошнім галасаваньні ў ірляндзкім парляманьце ўрад быў уратаваны ад упадку голасам старшыні, які даў перавагу аднаго голасу ўрадавай большасьці. Апазыцыйная прэса накінулася дзеля гэтага на парляманцкіх павадыроў апазыцыі, якія так дрэнна падрыхтавалі атаку на ўрад, прагледзеўшы магчымасьць свайго паражэньня. Але хутка высьнілася, што прычына няўдачы апазыцыі—ня ў дрэнным аблічэньні сваіх сілаў, але—ў залішне „спрытнай“ тактыцы агентаў урадавай большасьці. Выясьнілася, што „штаб“ урадавай большасьці, так сама падлічыўшы галасы і ўбачыўшы, што апазыцыя мае ўсё-ж на адзін голас больш, як урадавая „большасьць“, пастанавіў неяк „украсьці“ аднаго з паслоў апазыцыі, каб пазбавіць яго магчымасьці галасаваць у рашучы мамэнт у справе даверыя, ці недаверыя да ўраду. Так і зрабілі: гэтага пасла, які—пэўна ж—ня дурань быў выпіць, зацягнулі сьпярша ў буфэт, а адтуль павезьлі недзе далей. Адным словам, у рашучы мамэнт апазыцыя недалічылася аднаго голасу... Гэтай „сьмешнай“ справай цяпер займаецца ўся ірляндзкая і англійская прэса... А няўдалы „прадстаўнік народу“, якога можна так абдурыць ды „ўкрасьць“, як ката ў мяшку,—стаўся пасьмешышчам усяго краю. Імя яго—Джынко—адгэтуль пэўна-ж зробіцца агульна-ўжыванай „лаянкай“. Калі трэба будзе заклеймiць такога дурнога ды нягоднага „народнага прадстаўніка“...

Рэдактар-Выдавец: П. Кумпяк.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.